Статут зарэгістраваны
Дзяржаўным камітэтам
па справах рэлігій
і нацыянальнасцей
Рэспублікі Беларусь
13 мая 1999 года
Рэгістрацыйны № 114

Місія перарэгістравана
Камітэтам па справах рэлігій
і нацыянальнасцей
пры Савеце Міністраў
Рэспублікі Беларусь
“2” верасня 2004 года
рэгістрацыйны № 090

Старшыня Камітэта
Буко С.І.

“Зацвярджаю”
Арцыбіскуп Мітрапаліт
Мінска-Магілёўскі
Кардынал Казімір Свёнтэк

“2_” _________ 2004 года

“Узгоднена”
Дырэктар Рэлігійнай місіі
«Дабрачыннае каталіцкае
таварыства Карытас» Канферэнцыі
Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі
ксёндз Міхаіл Сапель

“20” _________ 2004 года

# Статут

## Рэлігійнай місіі
## «Дабрачыннае каталіцкае таварыства Карытас»
## Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла
## ў Рэспубліцы Беларусь

# 1. Агульныя палажэнні

1.1 Рэлігійная місія "Дабрачыннае каталіцкае таварыства Карытас" Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь (далей – "Карытас") з'яўляецца рэлігійнай арганізацыяй, утворанай Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіяй Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь.

1.2 Поўнае найменне Карытас:

на беларускай мове: *Рэлігійная місія "Дабрачыннае каталіцкае таварыства Карытас" Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь*;

на рускай мове: *Религиозная миссия "Благотворительное католическое общество Каритас" Минско-Могилёвской архиепархии Римско-католической Церкви в Республике Беларусь.*

Скарочанае найменне Карытас:

на беларускай мове – *Рэлігійная місія "ДКТ Карытас" ММА;*
на рускай мове – *Религиозная миссия "БКО Каритас" ММА.*

1.3 Тэрыторыя дзейнасці Карытас распаўсюджваецца на тэрыторыю дзейнасці Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь.

1.4 Карытас здзяйсняе сваю дзейнасць у адпаведнасці з гэтым Статутам і нормамі кананічнага права Рымска-каталіцкага Касцёла пры захаванні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Закона Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях" і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

1.5 Карытас з'яўляецца юрыдычнай асобай, мае ва ўласнасці адасобленую маёмасць, мае адасоблены баланс, нясе самастойную адказнасць па сваіх абавязацельствах, можа ад свайго імя набываць і здзяйсняць маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы, выконваць абавязкі, быць істцом і адказчыкам у судзе. Карытас мае права адкрываць бягучыя і іншыя рахункі ва ўстановах банкаў як у беларускіх рублях, так і ў замежнай валюце, мець круглую пячаць, штампы, бланкі і іншыя рэквізіты са сваім найменнем і сімволікай.

Эмблемай Карытас, выява якой змешчана на пячаці, з'яўляецца *чырвоны роўнастаронні крыж, у вуглах якога размешчаны тры перарывістыя чырвоныя хвалістыя стужкі. На крыжы па гарызанталі надпіс белымі лацінскімі літарамі "Caritas".*

1.6 Карытас падтрымлівае міжнародныя сувязі і кантакты, заключае неабходныя для гэтага пагадненні і дагаворы, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь і яе міжнародным абавязацельствам.

1.7 Справаводства вядзецца ва ўстаноўленым парадку. Дакументы, вызначаныя дзеючым заканадаўствам, перадаюцца ва ўстановы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь па месцы знаходжння юрыдычнага адрасу Карытас.

1.8 Месца знаходжання Карытас: 223058, Мінскі р-н, Бараўлянскі с/с, в. Лескаўка, вул. Карытас, 1.

## 2. Мэты, задачы і формы дзейнасці

2.1 Асноўнай мэтаю Карытас з'яўляецца распаўсюджванне і здзяйсненне праз дабрачынную дзейнасць запаведзяў Езуса Хрыста аб хрысціянскай міласэрнасці.

2.2 Задачамі і формамі дзейнасці Карытас з'яўляюцца:

- прапаганда і выхаванне у людзях любові і павагі адзін да аднаго на падставе прынцыпаў хрысціянскай маралі;
- аказанне індывідуальнай і групавой дапамогі дзецям-сіротам, хворым, інвалідам, мнагадзетным сем'ям, самотным, бяздомным, састарэлым людзям, вязням і іншым патрабуючым;
- арганізацыя адпачынку і аздараўлення дзяцей на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і за мяжой у парадку, установленым заканадаўствам;
- арганізацыя абследавання з магчымасцю праходжання неабходнага курса лячэння, у тым ліку аператыўнага, у парадку, установленым заканадаўствам;
- стварэнне банка дадзеных аб патрабуючых і месцах іх размяшчэння;
- здзяйсненне доўгатэрміновых праектаў па будаўніцтву дабрачынных установаў сумесна з юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь і іншых краін у парадку, установленым заканадаўствам;
- здзяйсненне выдавецкай дзейнасці, выкарыстанне сродкаў масавай інфармацыі для прапаганды дзейнасці Карытас з мэтаю прыцягнення сродкаў для аказання дабрачыннай дапамогі ў адпаведнасці са статутнымі мэтамі і задачамі;
- прыём і размеркаванне ў парадку, установленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, ахвяраванняў і іншай дапамогі (у тым ліку гуманітарнай) ад фізічных і юрыдычных асобаў як Рэспублікі Беларусь, так і з-за мяжы, у тым ліку замежнай бязвыплатнай дапамогі;
- правядзенне канферэнцый, выстаў, бясед, сустрэчаў, культурна-масавых, аздараўленчых, рэлігійных і іншых мерапрыемстваў у парадку, установленым заканадаўствам;
- стварэнне структурных падраздзяленняў для дасягнення статутных мэтаў і задач Карытас у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;
- стварэнне дабрачынных і камерцыйных арганізацый для дасягнення статутных мэтаў і задач Карытас у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;
- супрацоўніцтва ў правядзенні дабрачынных мерапрыемстваў з рэлігійнымі і свецкімі дабрачыннымі арганізацыямі, а таксама прыватнымі асобамі.

Карытас можа здзяйсняць і іншую, не забароненую заканадаўствам Рэспублікі Беларусь дзейнасць, якая спрыяе рэалізацыі статутных мэтаў і задач.

2.3 Віды дзейнасці, якія падлягаюць ліцэнзаванню, могуць здзяйсняцца толькі пасля атрымання адпаведных ліцэнзій.

# 3. Сяброўства

3.1 Сябрамі Карытас могуць быць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, а таксама замежныя грамадзяне, якія дасягнулі васемнаццацігадовага ўзросту, незалежна ад іх нацыянальнай і прафесійнай прыналежнасці, якія актыўна ўдзельнічаюць у дабрачыннай дзейнасці, дапамагаюць здзяйсняць мэты і задачы, прадугледжаныя гэтым Статутам. Прыём у сябры Карытас здзяйсняецца Дырэктарам на падставе пісьмовай заявы кандыдата.

3.2 Сябры Карытас маюць права:
- абіраць і быць абраным у кіруючыя органы Карытас;
- свабоднага выхаду з Карытас.

3.3 Сябры Карытас абавязаныя:
- прымаць удзел у дзейнасці Карытас;
- весці хрысціянскі лад жыцця;
- падпарадкоўвацца кіраўніцтву Карытас у пытаннях яго кампетэнцыі;
- не рабіць дзеянняў, якія наносяць матэрыяльную ці маральную шкоду Карытас.

3.4 Выключэнне з сяброў Карытас магчыма за парушэнне патрабаванняў Статута ці норм хрысціянскай маралі. Рашэнне аб выключэнні прымаецца Дырэктарам Карытас па ўзгадненні з Радай Карытас. Выхад з сяброў Карытас таксама можа адбывацца на падставе пісьмовай заявы сябра Карытас.

3.5 Пры выхадзе ці выключэнні з сяброў Карытас фінансавыя і матэрыяльныя сродкі вяртанню не падлягаюць, калі іншае не абумоўлена пры іх перадачы.

3.6 Сябры Карытас адначасова з'яўляюцца сябрамі Рэлігійнай місіі "Дабрачыннае каталіцкае таварыства Карытас" Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі.

# 4. Кіраванне

4.1 Арцыбіскуп Мінска-Магілёўскі як кіраўнік Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь:

- прымае рашэнне аб стварэнні і, у выпадку неабходнасці, рэарганізацыі ці ліквідацыі Карытас;
- вызначае асноўныя накірункі дзейнасці Карытас;
- зацвярджае Статут Карытас, уносіць у яго змены і дапаўненні;
- прызначае на пасаду і адклікае Дырэктара Карытас (далей – "Дырэктар");
- здзяйсняе кантроль за фінансава-гаспадарчай дзейнасцю і дзейнасцю кіраўніцтва Карытас.

4.2 Бягучае кіраванне дзейнасцю Карытас здзяйсняе Дырэктар, які валодае ўсімі правамі кіраўніка юрыдычнай асобы, у тым ліку:

- кіруе ўсёй дзейнасцю Карытас;
- прадстаўляе Карытас без даверанасці ў дзяржаўных органах, грамадскіх, рэлігійных і іншых арганізацыях як Рэспублікі Беларусь, так і замежных краін;
- вызначае абавязкі сяброў Рады і іншых супрацоўнікаў Карытас;
- прызначае і адклікае намесніка Дырэктара;
- інфармуе Арцыбіскупа Мінска-Магілёўскага аб дзейнасці Карытас;
- здзяйсняе прыём у сябры Карытас;
- па ўзгадненні з Радай Карытас здзяйсняе выключэнне з сяброў Карытас;
- мае права першага подпісу на фінансавых і іншых дакументах;
- прымае рашэнні аб набыцці і распараджэнні маёмасцю Карытас, выдае даверанасці і заключае дагаворы;
- прымае рашэнні аб стварэнні структурных падраздзяленняў Карытас і зацвярджае іх палажэнні;
- распрацоўвае гадавыя планы работы Карытас;
- вызначае гадавы бюджэт і смету выдаткаў Карытас;
- здзяйсняе іншыя паўнамоцтвы, якія ўскладае на яго Арцыбіскуп Мінска-Магілёўскі.

4.3 Дырэктар на час сваёй адсутнасці можа загадам перадаць поўнасцю ці часткова выкананне сваіх абавязкаў намесніку.

4.4 Арцыбіскуп Мінска-Магілёўскі пры неабходнасці прызначае эканамічнага дырэктара Карытас (далей – эканамічны дырэктар), які:

- кіруе фінансавымі справамі Карытас;
- складае праекты бюджэта і робіць фінансавыя справаздачы;
- мае права першага подпісу на фінансавых дакументах.

Эканамічны дырэктар падпарадкоўваецца дырэктару Карытас.

Падчас вакансіі пасады дырэктара эканамічны дырэктар выконвае абавязкі дырэктара.

4.5 Рада Карытас (далей – "Рада") – гэта дарадчы орган, які ствараецца Дырэктарам па прапанове Агульнага сходу, у складзе чатырох асобаў. Персанальны склад Рады пераглядаецца па меры неабходнасці па рашэнні Агульнага сходу.

4.6 Пасяджэнне Рады праводзіцца па меры неабходнасці, але не радзей за адзін раз у паўгоддзе.

4.7 Рада:

- распрацоўвае і выносіць на разгляд Арцыбіскупа Мінска-Магілёўскага прапановы аб унясенні зменаў і дапаўненняў у Статут Карытас;
- абмяркоўвае перспектыўныя і гадавыя праграмы дзейнасці, бюджэт Карытас;
- рэкамендуе Дырэктару кандыдатуру яго намесніка;
- уносіць рэкамендацыі па кадравых пытаннях;
- абмяркоўвае стан фінансавых і маёмасных фондаў.

4.8 Агульны сход склікаецца па меры неабходнасці па ініцыятыве Арцыбіскупа Мінска-Магілёўскага, Дырэктара ці 1/3 сяброў Карытас і складаецца з усіх сяброў Карытас.

Агульны сход:

- выносіць на разгляд Дырэктара кандыдатуры ў Раду;
- можа выносіць на разгляд Арцыбіскупа Мінска-Магілёўскага, Дырэктара ці Рады прапановы па любых пытаннях дзейнасці Карытас.

## 5. Сродкі і маёмасць

5.1 Ва ўласнасці Карытас могуць знаходзіцца зямельныя ўчасткі, аб'екты вытворчага, сацыяльнага, дабрачыннага, культурна-асветніцкага і іншага прызначэння, грашовыя сродкі, у тым ліку ў замежнай валюце, прадметы рэлігійнага прызначэння і іншая маёмасць і каштоўнасці, неабходныя для забеспячэння дзейнасці Карытас.

5.2 Карытас валодае правам уласнасці на маёмасць, набытую ці створаную на ўласныя сродкі, ахвяраваную грамадзянамі, арганізацыямі і перададзеную Карытас ва ўласнасць дзяржаваю, або набытую іншымі спосабамі, якія не супярэчаць дзеючаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

5.3 Сродкі Карытас фарміруюцца за кошт:

- добраахвотных ахвяраванняў фізічных і юрыдычных асобаў як Рэспублікі Беларусь, так і замежных дзяржаў;
- паступленняў ад дзейнасці Карытас і з іншых крыніцаў, не забароненых дзеючым заканадаўствам.

5.4 Карытас можа выкарыстоўваць для сваіх патрэбаў будынкі і маёмасць, якія прадастаўляюцца ёй на дагаворных пачатках дзяржаўнымі, грамадскімі, рэлігійнымі арганізацыямі ці грамадзянамі.

5.5 Карытас можа мець ва ўласнасці будынкі, транспартныя сродкі, збудаванні, абсталяванне, жыллёвы фонд, грашовыя сродкі і іншую маёмасць, неабходную для матэрыяльнага забеспячэння дзейнасці, прадугледжанай Статутам.

5.6 Сродкі і маёмасць Карытас выкарыстоўваецца толькі для дасягнення Статутных мэтаў і задач і адпаведна гэтым мэтам.

## 6. Спыненне дзейнасці

6.1 Карытас спыняецца шляхам яе рэарганізацыі ці ліквідацыі.

6.2 Рэарганізацыя ці ліквідацыя Карытас здзяйсняецца па рэшэнні Арцыбіскупа Мінска-Магілёўскага. Ліквідацыя таксама можа быць здзейснена па рашэнні суда.

6.3 У выпадку спынення дзейнасці Карытас, яе маёмасць, атрыманая ў карыстанне па дагаворах, вяртаецца ранейшым уладальнікам, а ўласная маёмасць пераходзіць у распараджэнне Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь.

6.4 На маёмасць культавага прызначэння, якая знаходзіцца ва ўласнасці Карытас, не можа быць звернута спагнанне па прэтэнзіях крэдытораў.

Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь
КАНЦЫ-ЛЯРЫЯ

Прошито и скреплено печатью 7 (семь) листов

Консультант отдела по делам религий
Комитета по делам
религий и национальностей
при Совете Министров
Республики Беларусь Д.С.Елизаров